**В. М. Сцепанюк,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі
гімназіі № 6 г. Брэста імя Маршала Савецкага Саюза Г.К. Жукава

# Зіма ў вершы і на карціне

На сучасным этапе развіцця грамадства перад школай стаяць складаныя задачы. Неабходна падрыхтаваць усебакова адукаванага вучня, здольнага да далейшага самаўдасканальвання. Трэба дапамагчы зарыентавацца ў неабсяжным моры інфармацыі, выбраць сапраўды неабходнае, асэнсаваць неадназначнасць, шматграннасць свету. Усё ў жыцці ўзаемазвязана, нішто не ўзнікае само па сабе і не знікае без следу. Гэта ідэя знаходзіць адлюстраванне ў міжпрадметнай інтэграцыі. Узаемапранікнёнасць дысцыплін дапамагае вучням больш глыбока асэнсаваць з'явы жыцця і ўсвядоміць сябе як частку сусвету.

І ў той самы час неабходна захаваць і ўмацаваць здароўе дзяцей, таму так важна зменшыць нагрузку на вучня, дазволіць яму выбіраць самому, якому віду дзейнасці аддаць перавагу.

На дадзеным уроку я прымяніла тэхналогію поўнага засваення ведаў, паспрабаваўшы рашыць наступныя задачы: зменшыць аб'ём дамашняга задання, выклікаць у вучняў пачуццё замілаванасці беларускай прыродай, развіваць творчае ўяўленне і мастацкі густ.

Урок беларускай літаратуры ў 6 класе

*Тэма: ПАЎЛЮК ТРУС "ПАДАЮЦЬ СНЯЖЫНКІ"*

Мэты:

- вучні павінны ведаць змест верша; умець вызначаць яго вобразны і інтанацыйны лад, мастацкія асаблівасці; умець выразна чытаць вершаваныя творы, параўноўваць творы літаратуры і творы жывапісу;

- стварыць умовы для развіцця творчых здольнасцей вучняў, рэпрадуктыўнага і творчага ўяўлення ў працэсе знаёмства з вершам;

- садзейнічаць выхаванню здольнасці захапляцца прыгажосцю прыроды.

Абсталяванне: партрэт П. Труса, рэпрадукцыя В. Бялыніцкага-Бірулі “Зімовы сон” (у падручніку), зімовыя пейзажы, лісты паперы, фламастары, папяровыя сняжынкі, дыскі з запісамі (І. Лучанок “Падаюць сняжынкі”, ENYA “Winter”).

Тып урока**:** камбінаваны.

Ход урока

І. Фанетычная размінка:

Тодару Хвядора
Падарыла творы.
Тодар ледзь паверыў,
Што яны з паперы.
Падарыхі ружы
Не баяцца сцюжы.

В. Жуковіч

ІІ. Уступнае слова. Матывацыя

Ці ведаеце вы, што на Беларусі не чатыры, а шэсць пор года?

Паглядзіце за акно. Што мы там бачым? Дрэвы без лісця, чорныя ствалы, голыя галіны, пажоўклая трава, шэрая зямля. Канец лістапада – *прадзім’е*. Хутка надыдзе зіма, усё скуе мароз, і над зямлёй закружацца першыя сняжынкі. Мы з вамі ўявім сёння, як гэта будзе. Дапаможа нам паэт Паўлюк Трус, які пражыў вельмі кароткае жыццё, але пакінуў нам у спадчыну светлы лірычны твор – паэму “Дзясяты падмурак”, урывак з якой мы сёння разгледзім, вызначым яго мастацкія асаблівасці, навучымся выразна чытаць і нават праілюструем яго. Усё гэта дапаможа нам выканаць дамашняе заданне – вывучыць верш на памяць. Гэта верш “Падаюць сняжынкі” (*У сшытку запісваецца тэма ўрока*).

Звярніце ўвагу на дошку. Колькі тут розных сняжынак, якія вы падрыхтавалі! Яны такія ж непадобныя адна на адну, як і вы самі, кожная мае

свой характар. Ці ведаеце вы, што, выразаючы свае сняжынкі, вы далучыліся да старадаўняга народнага мастацтва – *выцінанкі*? Ад слова "выцінаць" – выразаць з паперы карункі і нават цэлыя складаныя кампазіцыі. Зараз выцінаныя шэдэўры знаходзяцца ў мастацкіх музеях побач з палотнамі славутых мастакоў.

У даўнія часы выцінанкі мелі таксама магічны сэнс. Іх рабілі і вешалі ў доме, у гаспадарчых пабудовах як абярэгі ад хвароб і злых сіл. Няхай нашы сняжынкі-выцінанкі дапамогуць нам сёння працаваць.

А зараз такое заданне. Запішыце ў сшыткі тыя словы і выразы, якія ў вас асацыіруюцца са словам "*сняжынка*". Музыка дапаможа вам плённа працаваць, сабрацца з думкамі .(*Вучні працуюць пад музыку (ENYA "Winter"), потым зачытваюць, што атрымалася*).

III.Слоўнікавая работа

- Перш чым мы пазнаёмся з вершам, правядзем слоўнікавую работу. (*На дошцы выпісаны словы з верша "Падаюць сняжынкі"):*

-дыямент – алмаз, брыльянт

- долу – уніз

- бомы – званочкі на конскай збруі

- пялёсткі – лісточкі вакол сэрцавіны кветкі

- туга – сум, адчай

- мярэжа – сетка

- альвас – хатняя расліна, алоэ.

IV. Чытанне верша

- Зараз я буду чытаць верш. Вы ўважліва слухайце і падкрэслівайце ў сваіх запісах, дзе вы падбіралі сінонімы да слова "сняжынка", тыя словы ці выразы, якія супадаюць з тэкстам верша.

– Мы з вамі ўжо ведаем, якія ёсць сродкі мастацкай выразнасці. Давайце іх пералічым.(*Метафара, эпітэт, параўнанне, увасабленне*). Знайдзіце, калі ласка, у вершы і запішыце ў свае сшыткі прыклады мастацкіх сродкаў. (*Вучні працуюць, потым афішыруюць свае работы*)

– Для чаго аўтар выкарыстоўвае мастацкія сродкі?

VI. Аналітычная работа над творам жывапісу

Пазнаёмімся з рэпрадукцыяй карціны беларускага мастака В. Бялыніцкага-Бірулі “Зімовы сон”. Давайце параўнаем наш верш – літаратурны твор і рэпрадукцыю карціны – жывапісны твор.

- Які дзень мы бачым на карціне?

(*пахмурны, снежны, спакойны).*

-Якімі сродкамі мастак дасягае такога эфекту?

(*падборам фарбаў, размытымі лініямі).*

- Як вы думаеце, дзень на карціне ціхі?

(*так, таму і называецца “Зімовы сон”)*

Што аб’ядноўвае верш П. Труса і карціну В. Бялыніцкага-Бірулі і чым яны адрозніваюцца?

*(іх аб’ядноўвае тэма зімы, а адрозніваюцца яны тым, што на карціне ціха, а ў вершы ёсць рух і гукі).*

Фізкукльтпаўза. А цяпер заплюшчыце, калі ласка, вочы і ўявіце сабе што-небудзь вельмі добрае і прыемнае, кожны сваё. Хто мае патрэбу, можа зрабіць практыкаванні для рук і шыі (кругавыя рухі галавой, сцісканне і расціскanne рук). (*Пад музыку вучні робяць фізічныя практыкаванні*)

VII. Ілюстраванне верша

- Сёння мы з вамі пабудзем мастакамі, паспрабуем намаляваць наш верш. Канешне, не так, як В. Бялыніцкі-Біруля, а вельмі проста, схематычна. Гэта дапаможа нам лепей запомніць змест верша і завучыць яго на памяць. Каб вам было больш зразумела, я для прыкладу праілюстравала першую страфу верша (*ілюстрацыі вывешваюцца на дошку*). Астатнія строфы вы праілюструеце самі. (*Клас падзяляецца на пяць груп і робіць схематычныя асацыятыўныя ілюстрацыі да верша.)* Пакуль вы гэта робіце, паслухайце, калі ласка, музычную інтэрпрэтацыю нашага верша – песню на музыку Ігара Лучанка *(Гучыць запіс песні).*

VIII. Чытанне верша і дэманстрацыя ілюстрацый да кожнай страфы

-Давайце яшчэ раз прачытаем верш, які мы праілюстравалі**.** **(***Паўторнае чытанне верша***).**

А цяпер загарніце, калі ласка, падручнікі і паспрабуйце прачытаць верш, гледзячы толькі на ілюстрацыі. (*Выкліканы вучань чытае верш, гледзячы на ілюстрацыі).*

IX. Падагульненне. Рэфлексія

- Ці спадабаўся вам такі спосаб завучвання верша?

- Што найбольш запомнілася?

Што выклікала цяжкасці?

Ці лёгка будзе вам зараз выканаць дамашняе заданне – вывучыць верш на памяць?

X. Дамашняе заданне

-Вывучыць верш на памяць (для ўсіх).

- Зрабіць паведамленне пра які-небудзь з відаў народнага мастацтва.

- Падрыхтаваць звязнае выказванне па рэпрадукцыі карціны В. Бялыніцкага-Бірулі “Зімовы сон”.